Coordination Council

Information support – **info@rada.vision**
Press office – **press@rada.vision**
Telegram – **rada_vision**
Webpage – **www.rada.vision**

ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ
па правядзенні выбараў
у Каардынацыйную Раду ІІІ склікання

# РАШЭННЕ
аб выключэнні кандыдата са спісу выбарчага суб’екта
і ўнясенні зменаў у Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў

30 красавіка 2024 года г. Варшава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду ІІІ склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разглядзеўшы ліст ад кандыдата выбрачага спісу “Воля” Вадзіма Кабанчука,

**ВЫЗНАЧЫЛА:**

29 красавіка 2024 года ў Выбарчую камісію паступіў ліст ад кандыдата і ініцыятара спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Воля” Вадзіма Кабанчука, у якім утрымліваецца просьба выключыць яго са спісу па ўважных прычынах.

У адпаведнасці з пп. 7.1 пункта 7 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года, кандыдат управе самастойна звярнуцца ў Выбарчую камісію па пытанні выключэння яго са спіса выбарчага суб’екта. Пры гэтым ніякага абгрунтавання прычын ці іншых патрабаванняў да такога кандыдата не прадугледжваецца.

Кіруючыся вышэй указанай нормай, Выбарчай камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

Кандыдата спіса выбарчага суб’екта “Воля” Вадзіма Кабанчука пад нумарам 1 - са спісу выключыць.

Унесці адпаведныя змяненні ў Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года; спіс кандыдатаў прывесці ў адпаведнасць з патрабаваннямі Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька